ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 54

Задача масквіча Паўла Мурашова ***(гл. дыяграму)*** атрымала на нядаўнім беларускім конкурсе першы ганаровы водгук.

Белыя: Крa3, Фg2, Лc5, Лc8, Кc7, Кd3, пп. b4, f3, f6 (9).

Чорныя: Крd6, Лd5, Лh7, Кd8, пп. d4, d7, f5, h2 (8).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Батумі (Грузія) прайшла 43-я Сусветная шахматная алімпіяда. У мужчын у барацьбу ўступілі 184 каманды. Сярод гульцоў былі экс-чэмпіёны свету В. Ананд, У. Крамнік, Р. Панамароў, Р. Касымжанаў, віцэ-чэмпіёны Б. Гельфанд, П. Лека, С. Каракін, цяперашні прэтэндэнт на карону Ф. Каруана... Тры каманды набралі па 18 балаў, таму прызавыя месцы размеркаваліся па дадатковых паказчыках: 1. Кітай; 2. ЗША; 3. Расія. У дзясятку найлепшых трапілі таксама Польшча, Англія, Індыя, В'етнам, Арменія, Францыя і Украіна.

Беларуская зборная (капітан Уладзімір Тукмакоў, трэнер-аналітык Андрэй Жыгалка) мела сямнаццаты стартавы рэйтынг, але фінішавала, на жаль, з 14 баламі толькі на трыццатым месцы. Швейцарская сістэма спаборніцтва падобная на «арэлі»: кожная перамога ўздымае каманду ўверх, але і гуляць наступны матч даводзіцца з мацнейшым; пасля паражэння — «спуск» і слабейшы наступны сапернік... Напачатку беларусы перайгралі Малайзію (3,5:0,5) і Аўстралію (2,5:1,5), але потым саступілі Ірану (1:3). Зноў перамогі (над Казахстанам — 2,5:1,5, Аўстрыяй — 3:1, Турцыяй — 2,5:1,5), але потым тры запар паражэнні ад моцных камандаў (ад Арменіі і Расіі — па 1:3, першай зборнай Грузіі — 1,5:2,5). Фінішавалі ж нашы суайчыннікі перамогамі над Таджыкістанам (3:1) і Чылі (3,5:0,5). На першай дошцы Уладзіслаў Кавалёў набраў 6 ачкоў з 9 (4 перамогі, 1 пройгрыш, 4 нічыі, у тым ліку са славутымі Лявонам Аранянам і Сяргеем Каракіным). У Сяргея Жыгалкі — 5,5 з 10 (+3-2=5), у Аляксея Аляксандрава — 4,5 з 9 (+3-3=3), у Кірыла Ступака — 5,5 з 9 (+2-0=7), у запаснога Аляксея Фёдарава — 3,5 з 7 (+2-2=3).

Аляксей Аляксандраў — Давід Шэнгелія (Аўстрыя). 1.d4 Kf6 2.c4 e6 3.Kc3 Cb4 4.e3 0-0 5.Cd2 Лe8 6.Cd3 b6 7.Kf3 Cb7 8.0-0 c5 9.a3 Ca5 10.b4 cb 11.Kb5 C:f3 12.Ф:f3 Kc6 13.Kd6 Лf8 14.e4 b3 15.Ce3 Cc3 16.e5 Ke8 17.K:e8 Л:e8 18.Лad1 Лc8 19.C:h7+ Кр:h7 20.Фh5+ Крg8 21.Cg5 C:d4 22.C:d8 Лe:d8 23.Лd3 b2 24.Лh3 Крf8 25.Лf3 K:e5 26.Фh8+ Крe7 27.Фh4+ f6 28.Ф:d4 Л:c4 29.Ф:b2 K:f3+ 30.gf Лdc8 31.Лd1 d5 32.Крg2 Л8c5 33.Фb1 Лc2 34.Лd4 e5 35.Лa4 Лd2 36.Л:a7+, 1:0.

Мустафа Йылмаз (Турцыя) — Уладзіслаў Кавалёў. 1.d4 Kf6 2.c4 e6 3.Kf3 d5 4.Kc3 c5 5.cd cd 6.Ф:d4 ed 7.e4 Kc6 8.Cb5 de 9.Ф:d8+ Кр:d8 10.Kg5 Be6 11.K:e6+ fe 12.C:c6 bc 13.Крe2 Cb4 14.Лd1+ Крe7 15.Ka4 Лhd8 16.Ce3 Лd5 17.Лac1 Kg4 18.Cc5+ C:c5 19.K:c5 Kf6 20.Лd2 Лf8 21.Лc4 Kg4 22.K:e4 K:f2 23.Лdc2 Лe5 24.Крe3 Kg4+ 25.Крd3 Лd8+ 26.Крe2 c5 27.Крf3 K:h2+ 28.Крf4 Лf5+ 29.Крe3 Kg4+ 30.Крe2 Лe5 31.Крf3 h5 32.Л2c3 Kh2+ 33.Крg3 Kf1+ 34.Крh3 Лd1 35.Лa4 a5 36.K:c5 Ke3 37.Л:a5 Лg5 38.Лa7+ Крe8 39.g4 Л:g4, 0:1.

Пра жаночую Алімпіяду — у наступным выпуску.

* * *

У час Алімпіяды кангрэс Міжнароднай шахматнай федэрацыі абраў новым прэзідэнтам ФІДЭ Аркадзя Дварковіча, былога расійскага віцэ-прэм'ера. Віцэ-прэзідэнтам ФІДЭ абрана старшыня Беларускай шахматнай федэрацыі Анастасія Сарокіна. Вырашана таксама, што Алімпіяда-2022 пройдзе ў Мінску.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.K:d4. Першымі правільна адказалі Аляксандр Сямерыч, Ігар Ананіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Уладзімір Ізотаў.

Вадзім ЖЫЛКО.

Тэлесеткі

Успамінаючы Дабралюбава

Да 85-годдзя з дня нараджэння народнага артыста Беларусі, педагога і аднаго са знакавых рэжысёраў айчыннага кіно Ігара Дабралюбава тэлеканал «Беларусь 3» прымеркаваў рэтраспектыву фільмаў майстра.

Так, 22 кастрычніка гледачы ўбачаць знакамітую «народную камедыю» «Белыя росы». У аўторак 23 кастрычніка будзе паказана ваенная кінааповесць «Іван Макаравіч». 24 кастрычніка ахвотныя змогуць паглядзець фільм «Братушка» , 25 кастрычніка ў праграме — кінааповесць «Расклад на паслязаўтра», а завершыць тэматычны тыдзень у пятніцу 26 кастрычніка кінастужка «Мама, я жывы» (1985). Дарэчы, як адзначаюць на «Беларусь 3», усе пяць фільмаў будуць суправаджацца схаванымі субцітрамі.

Фінішная прамая для «Еўрабачання»

На гэтым тыдні ў Беларусь прыбыла каманда спецыялістаў Еўрапейскага вяшчальнага саюза, якая разам з Белтэлерадыёкампаніяй працуе над падрыхтоўкай фінальнага шоу дзіцячага «Еўрабачання-2018». У прыватнасці, у Мінск прыляцеў шоу-прадзюсар конкурсу Гордан Банела, рэжысёр тэлевізійнай трансляцыі Марэк Міл і тэхнічны дырэктар Тармо Крым, які адказвае за ўзаемадзеянне з рознымі службамі «Мінск-Арэны». А крыху больш чым праз два тыдні пачнецца і абсталяванне сцэнічнай пляцоўкі, на якой неўзабаве пройдуць рэпетыцыі артыстаў з 20 краін-удзельніц.

Дарэчы, у адрозненне ад дарослага шоу, на дзіцячым, пачынаючы з мінулага года, можна галасаваць за сваю краіну. Інтэрнэт-галасаванне гледачоў стартуе за 48 гадзін да пачатку трансляцыі на афіцыйным сайце конкурсу junioreurovision.tv, непасрэдна перад фінальным канцэртам прыпыніцца і адкрыецца зноў пасля выступлення ўсіх канкурсантаў, але толькі на 15 хвілін.

Вікіторыя ЦЕЛЯШУК.

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

КІНО ПА АЛФАВІЦЕ

«АГНІ ВЯЛІКАЙ ВЁСКІ»

TV1000Ru, 24—28 кастрычніка

Вясковаму кінатэатру «Радзіма» пагражае знішчэнне — яго літаральна зруйнуюць, калі толькі не здарыцца цуд. Напрыклад, паспяховая прэм'ера. Забяспечыць яе спрабуе адчайны кінамеханік Федзя, дзяўчына-каратыстка Жэня і акцёр Дзмітрый Дзюжаў. Праўда, апошні пра гэта яшчэ не ведае. Што атрымалася ў выніку? Камедыя карыкатур ад сына праслаўленага рэжысёра Аляксея Учыцеля, якая даводзіць, што галоўным мастацтвам па-ранейшаму застаецца кіно.

«БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ»

«Беларусь 2», з 22 кастрычніка

Дэтэктыўны серыял з 25 частак — расійская версія сусветна вядомага амерыканскага серыяла «Дэтэктыў Раш». Група аператыўных работнікаў Маскоўскага крымінальнага вышуку на чале са следчым Ганнай Шатровай займаецца, на першы погляд, дзіўнай працай — расследуе «мёртвыя справы» з архіва. Насамрэч факты, якія ўсплываюць праз шмат гадоў, і новыя тэхнічныя магчымасці дазваляюць, нарэшце, аднавіць справядлівасць і паставіць кропку не ў адной заблытанай крымінальнай гісторыі з мінулага...

«ВІНАВАТЫЯ ЗОРКІ»

ТБ3, 28 кастрычніка

Экранізацыя аднайменнага рамана Джона Грына, які расчуліў мільёны сэрцаў, і не толькі жаночых, па ўсім свеце. Хейзел хворая на рак, і нягледзячы на рэмісію, не адчувае ніякай радасці. У групе падтрымкі дзяўчына пазнаёмілася з Агастусам Уотэрсам, у якога з-за хваробы ампутаваная нага, і паступова закахалася ў яго. Маладая пара выправілася ў рамантычнае падарожжа, якое дапамагло ім зразумець, што сэнс і глыбіню жыцця можна адчуць на любым яго адрэзку.

«ГРАМАДЗЯНКА КАЦЯРЫНА»

«Беларусь 1», 27 кастрычніка

Маладая мастачка Кацярына пераязджае з Малдовы ў Маскву і каб выжыць у вялікім горадзе бярэцца за любую работу: афіцыянтка, прыбіральшчыца, пасудамыйка. Але ёй трэба як мага хутчэй атрымаць грамадзянства, каб аформіць апеку над сваёй малодшай сястрой. Таму дзяўчына рашаецца на фіктыўны шлюб, аднак у хуткім часе нечакана для самой сябе разумее, што яна і насамрэч закахалася ў «несапраўднага» мужа.

«ДОМ НА ЎЗБОЧЫНЕ»

«МІР», 23 кастрычніка

Позна ўначы сямейная пара вяртаецца дамоў у горад па мокрай шашы — і, як на бяду, Аляксандр не спраўляецца з кіраваннем і наязджае на адзінокага мінака. Жонка ўгаворвае яго пакінуць пацярпелага каля пасялковага шпіталя і вярнуцца дадому. У гэтага здарэння няма іншых сведак, але згрызоты сумлення не даюць галоўнаму герою жыць як раней. Пазней ён вяртаецца ў пасёлак, каб даведацца пра лёс пацярпелага і, магчыма, інкогніта яму дапамагчы — і высвятляе, што няшчасны ў коме...

Не ляціць кажан на рунь

Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек.

Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды».

Ці ведалі вы, што:

кажа́н — лятучая мыш;

наро́г — частка плуга, якая падразае зямлю знізу;

рунь — зялёныя ўсходы азімых пасеваў.

Перабіраць костачкі — абгаворваць каго-небудзь, распаўсюджваць плёткі. Беларускія адпаведнікі: *мянціць языком, перамываць костачкі*. Рускі: *молоть языком*.

Сядзець на хлебе і вадзе — жыць вельмі бедна, галадаць. Беларусы яшчэ скажуць: *класці зубы на паліцу, ляскаць зубамі*. Рускія: *сосать лапу*.

Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у раніцнім эфіры «Беларусь 3» кожную суботу.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.